# Стартавы тэст

***А1.Адзначце словы, у якіх спалучэнне літар Дз абазначае адзін гук:***

1) падземны 3) Радзіма 5) дзядуля
2) адзвінець 4) падзякаваць

***А2.Адзначце словы, у якіх літара Е абазначае два гукі:***

1) песня 3) елка 5) паехаць
2) занесці 4)пад'езд

***А3. Адзначце словы, у якіх пішацца літара Е:***

1) зн…важаць 3) л…карства 5) ма…тнік
2) падкле…ны 4) сённ…шні

***А4. Адзначце словы, у якіх пішацца літара А:***

1) ш…рсцяны 3) кр…шыць 5)д…брабыт
2) выкр…сліць 4) інт…лект

***А5. Адзначце словы, у якіх пішацца літара Ў:***

1) паўночна-…сходні 3) ро…нядзь 5) на …частку
2) да …ладзіка 4) у "Выбранае" …вайшлі

***А6. Адзначце словы, у якіх пішацца Ь:***

1)л…ецца 3) вяс…нянка 5) прамен…чык
2) пад…ём 4) дз…весце

***А7. Адзначце выпадкі, калі пры ўтварэнні патрэбнай формы назоўніка адбываецца чаргаванне зычных гукаў:***

1) вырасці на ( градка ) 3) узяць са ( стог ) 5) чарнець на ( снег )
2) ляжаць на ( сонца ) 4) цеста на ( малако )

***А8. Адзначце словы, якія пішуцца з вялікай літары:***

1) (Д, д)ом урада 3) (У,у)сходнія славяне 5) (М,м)іншчына
2) (В,в)льтава дуга 4)(К,к)оласавы паэмы

***А9. Адзначце словазлучэнні, у якіх выдзеленыя словы ўжыты ў пераносным значэнні:***

1) **цвёрды** грунт 3) **бура** пачуццяў 5**) ранні** званок
2**) круглы** сірата 4**) глухі** куток

***А10. Адзначце словы, якія пішуцца разам:***

1) міні…футбол 3) верба…лоз 5)паў…вядра
2) горка…салёны 4)хлеб…соль

***А11.Аднакаранёвымі да слова ГАРА з'яўляюцца словы:***

1) загар 3) агарод 5)узгорак
2) гарыстасць 4) горны

***А12. Адзначце назоўнікі з канчаткамі-а,-я:***

1) у глыбі лес… 3) абапал гасцінц… 5) без уздым…
2) каля кіёск… 4) загадчык клуб…

***А13. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 2-ой асобы множнага ліку маюць канчатак – ЫЦЕ:***

1) вуч…це 3) каж…це 5)бер…це
2) сустрака…це 4) вар…це

***А14. Адзначце лічэбнікі, якія напісаны правільна:***

1)абедзьве 3) дзвюма 5) дзве
2) двумя 4) дзвесці

***А15. Адзначце словы, якія пішуцца разам:***

1) (у)трох слупках 3) (з)боку дарогі 5) адысці (ў)бок
2) (з)ранку да вечара 4) дапамагчы (па)сяброўску

***А16. Адзначце словазлучэнні са словамі, якія з НЕ пішуцца разам:***

1) (не)разгорнуты падручнік 4) (не)сабраныя ўчора рэчы
2) (не)абдымны прастор 5) вялікі (не)дахоп
3) сказаць (не)падумаўшы

***А17. Адзначце сказы, у якіх на  месцы пропуску ставіцца працяжнік.***

1)Восень…роздуму пара.

2) Каліна…як полымя, чырвоная.

3) Вучыцца ў народа…задача кожнага пісьменніка.

4) Жыць у адзіноце…надзвычай пакутліва.

5) Бацькаў узрост…трыццаць пяць гадоў.

***А18. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску ставіцца коска.***

1)Пасля шчырай працы да чалавека прыходзіць хлеб_і песня, і шчасце.

2)Спакойнае_ды неглыбокае возера зачаравала нас.

3)Жартаваў дзядзька часта_ды ні разу нікога не пакрыўдзіў.

4)Невялікія_ светлыя воблачкі на асеннім небе зачаравалі мяне.

5)Аглушаны такой навіною, стаяў Раман ні жывы_ні мёртвы.

***А19.Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы выдзяляюцца коскамі.***

1)На гэтым месцы **кажуць** даўней быў горад.

2)Не пазнаць **Беларусь** сёння тваіх гарадоў і мястэчак.

3)Нялёгка знайсці **зразумела** сваю дарогу ў жыцці.

4)Месячнай ноччу **відаць** было далёка.

5)Мой сябар **можа** мне дапамагчы.

***А20.Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя азначэнні адасабляюцца.***

1)Адчынілі **паржавелыя ад вільгаці** дзверы

2)Снег **белы і сыпкі** пакрыў за ноч ўсё наваколле.

3)Сюды прыходзяць алені **згаладалыя за дзень.**

4)**Шыракаплечы, моцны** ён прыцягваў да сябе ўвагу.

5)Вавёрка **спалоханая намі** рыжай маланкай узляцела на дрэва.

***А21.Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя акалічнасці адасабляюцца***.

1)Мы ў той дзень працавалі **нягледзячы на стому.**

**2)**Паранены ішоў **хістаючыся.**

3)Увесь дзень і ўсю ноч дождж ліў **як з вядра.**

4)**Седзячы з вудай** можна забыцца пра ўсё на свеце.

5)Там **на ўсходзе** пачало чырванець неба.

***В1.Знайдзіце словазлучэнне з памылкай у кіраванні і запішыце яго правільна***:

1)паслаць па ўрача

2)даравацьь брату

3)хварэць грыпам

4)ажаніцца з Нінай

5)пайсці ў ягады

***В2.Выпішыце граматычную аснову назыўнога сказа***.

1)Чакайце мяне ў госці.

2)Учарашняга дня не вернеш.

3)Мудрая восеньская цішыня.

4)На балоце калісьці капалі торф.

5)Пахне восенню.

***В3.Дапішыце сказ.***

Спосаб падпарадкавальнай сувязі, пры якім залежнае слова ставіцца ў пэўным ускосным склоне, мае назву…

***В4.Вызначце стыль тэксту.***

Зноў успамінаецца май. Маладая зеляніна вакол. Усё такое жаўтавата-зялёнае.Вы, пэўна, заўважалі, што, калі распускаецца лес, здалёк ён выдае жаўтавата-зялёным. А калі яшчэ зацвітуць ласкавыя коцікі на лазовых кустах, то ён такім і сапраўды выглядае. Па-маладому, надзвычай вясёлым і светлым.